# ТВОРЧЫ АЛЬЯНС МАСТАЦТВА, НАВУКІ І ТЭХНАЛОГІЙ Ў КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНЫХ МАСТАЦКІХ ПРАКТЫК

*М.Л. Цыбульскі*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Развіццё мастацтва ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя сведчыць аб тым, што навацыйнасць і дынаміка сучасных мастацкіх працэсаў непасрэдна залежыць ад выкарыстання новых тэхнік і тэхналогій. Узаемадзеянне мастацтва з навукай і тэхналогіямі напрыканцы мінулага стагоддзя садзейнічала развіццю шэрагу эксперыментальных накірункаў, якія ў сукупнасці атрымалі назву science-art. У аснове ўсіх форм science-art прысутнічае навуковая праблематыка, навацыйныя тэхналогіі. Нярэдка творы science art маюць пад сабой сур'ёзную даследчую базу, абапіраюцца на дасягненні навукоўцаў аднак, ў першую чаргу, звяртаюцца да эмоцый, дазваляючы не толькі асэнсаваць, але і адчуць навуку.

*Мэта дадзенага артыкула* – прааналізаваць асаблівасці science-art і разглядзець асноўныя накірункі і найбольш значныя праекты у кожным з іх.

**Матэрыял і метады:** матэрыялам для дадзенага даследавання паслужылі праекты у галіне science-art, якія былі прадстаўлены на буйных сусветных выставах у апошнія некалькі дзесяцігоддзяў, а таксама тэарэтычныя даследаванні , прысвечаныя дадзенай праблеме. Асноўныя метады – гісторыка-храналагічны і кампаратыўны.

**Вынікі і абмеркаванне.** Узаемадзеянне навукі і мастацтвы адбывалася ў розныя перыяды XX стагоддзя. Але як паўнавартасная гібрыдная мастацкая форма мастацтва science-art склалася ў эстэтычных эксперыментах постмадэрнізму. Вытокі science-art звязаны з разнастайнымі эксперыментамі наватарства якіх заключалася, перш за ўсё, у выбары новых медыясістэм падачы мастацкага кантэнту. Канцэптуальна і вобразна аб’екты science-art накіраваны на эстэтызацыю навукова-тэхнічных і тэхналагічных з'яў.

Сёння science-art можна вызначыць як кірунак актуальнага мастацтва, які актыўна развіваецца, «у якім пры дапамозе сучасных тэхналогій, матэрыялаў і найноўшых выразных сродкаў, заснаваных на навуковых метадах, распрацоўках і дасягненнях, увасабляецца ў жыццё мастацкі вобраз» [1, С. 155-162]. Гэта свайго роду інтэграцыя дзвюх сфер чалавечай дзейнасці, творчая калабарацыя мастака і вучонага (або злучэнне гэтых роляў у адным чалавеку). Задача творцы заключаецца не проста ў транслiраванні, папулярызацыі навуковых і тэхналагічных ведаў, але ў змене поглядаў на тэхналогіі.

Тэрмін science-art да сённяшняга дня падвержаны дыскусіям даследчыкаў і саміх аўтараў праектаў. Ці не асноўнай праблемай з'яўляецца вызначэнне формы і параметраў узаемадачынення паміж

навуковым і мастацкім элементамі. Гледачы ж часта схільныя бачыць у творах сайнс-арта ў большай меры або прадукт навуковай дзейнасці, або, наадварот, мастацкі аб'ект. Так, арганізатар выставачных і выдавецкіх праектаў Дз. Булатаў лічыць тэрмін science art неудалым і прапануе замяніць яго на art in science, вызначаючы гэтую галіну як “навуку спакушаную мастацтвам” [2].

На самой справе межы паміж мастацкай творчасцю і навуковым даследаваннем у полі science art вызначыць практычна немагчыма. Невыпадкова даследчыца science art А.Я. Леўчанка як важную яго рысу вылучае «аб'яднанне і цеснае ўзаемадзеянне дзвюх сфер культуры - рацыянальна-дыскурсіўнай і мастацка-эстэтычнай. Сувязным звяном паміж імі з'яўляецца тэхніка-тэхналагічная сфера, – вытворная ад навукі і інструментальная для мастацтва» [3]. Па сваёй сутнасці аб'екты science art гэта гібрыдныя формы медыя, якія адносяцца да не традыцыйнай эстэтыкі. Іх важнай медыяльнай асаблівасцю “з'яўляецца бесперапыннае вар'іраванне параметраў мастацкіх форм, што неабходна для пошуку аптымальнага спалучэння іх выразных функцый” [4, с.224].

Science art можна успрымаць як свайго роду медыяавангард, які разам з тэхналогіямі новых медыяў, якія яго нарадзілі, захаваў каштоўнасці нонканфармізму і знаходзіцца ў стане пастаяннага абнаўлення. Немагчыма не заўважыць, што science art разбурае звыклую сур'ёзнасць і фундаментальнасць успрыняцця навукі і мастацтва, прапануе эксперыменты з тэхналогіямі, на мяжы іроніі і гульні. У гэтым праяўляецца забаўляльны кампанент science art [5] аб’екты якога у дадзеным кантэксце выконваюць ролю “поп-навукі”, “якая не адкрывае новыя веды, а займаецца стварэннем экстравагантных і сенсацыйных інтэрпрэтацый ужо наяўных ведаў” [6, с. 32]. Дзякуючы інтэрактыўнасці многіх аб’ектаў science art глядач ужо не проста назіральнік, ён выступае ў ролі сутворцы, які не столькі аналізуе, колькі рэфлексіруе падчас знаёмства з імі.

Нярэдка асноўнай формай science-art выступае інсталяцыя, якая паўстае як мадэль рэальнасці. Інсталяцыі ў якіх выкарыстоўваюцца жывыя бактэрыяльныя культуры, ствалавыя клеткі, штучныя органы атрымалі назву вільготных медыя ў супрацьлегласць сухім медыя электронных тэхналогій.

Science art не мае дакладных межаў. Унутры яго існуе мноства напрамкаў, сярод якіх варта назваць: бія-арт, робататэхніку (роба-арт), нейра-арт, інфа-арт, нана-арт, медыя-арт, тэлематычнае мастацтва, DATA-арт, саўнд-арт, светлавое мастацтва, штучны інтэлект, дапоўненую рэальнасць і інш [7].

Неабходнай умовай міждысцыплінарных практык з'яўляецца ацэнка вынікаў калабарацыі мастакоў з прадстаўнікамі навуковай супольнасці з пункту гледжання розных дысцыплінарных дыскурсаў. Паколькі прадмет знаходзіцца на стыку навукі, тэхнікі і мастацтва, значыць, яго

“інавацыйная каштоўнасць павінна быць ацэнена прадстаўнікамі не толькі арт-крытыкі, але і іншых спецыялізацый, нягледзячы на тое, што рэалізацыя гэтых працэсаў застаецца на тэрыторыі арт-інстытута”[8].

Відавочна, што science art прайшло толькі самую першую стадыю свайго станаўлення і далей будзе набіраць усё большую і большую сілу. У апошняе дзясяціґоддзе вялікая ўвага надаецца інстытуцыям, праграмам і курсам новых медыя, якія аб'ядноўваюць мастацтва і інфармацыйныя тэхналогіі, арганізацыі даследчых цэнтраў і лабараторый, дзейнасць якіх накіравана на ўмацаванне ўзаемаадносін мастацтва і навукі. Асаблівую ўвагу сёння прыцягвае штучны інтэлект (Artificial intelligence) і злучаныя з ім тэхналогіі развіццё якіх сведчыць, што “разрыў паміж AI і чалавекам скарачаецца”[9].

**Заключэнне**. Як вынікае са сказанага вышэй, science art – гэта накірунак сучаснага мастацтва на стыку мастацкага і навуковага, творчага і тэхналагічнага. Science Art развіваецца ў фармаце дыялогу паміж мастацтвам і навукай пры падтрымцы найноўшых медыятэхналогій. Звычайна творы "навуковага мастацтва" маюць пад сабой сур'ёзную даследчую базу, абапіраюцца на дасягненні навукоўцаў, і разам з тым звяртаюцца да эмоцый гледачоў.


1. Левченко О.Е. Science-art: проблемы терминологии // Вестник РГГУ. – 2014. – №14. – С. 155-162.
2. Булатов Д. Искусство будущего. Science Art: от посредников к медиаторам // Лекторий ВЕСНА. – 22 июля. – 2015 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=WFTEw6CCM9I/. – Дата доступа: 07.01.2023.
3. Жуланов Р. Лекция "Введение в Science Art" // Изучаем Digital Humanities [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://dhumanities.ru/material/vvedenie-v-science-art/. – Дата доступа: 05.01.2023.
4. Замков А.В., Сайнс-арт как медиамодель возможного будущего// Вестник Московского университета. Серия 10. Журналистика. – Москва: Изд-во МГУ им. Ломоносова, 2018. – №. 6. – С. 213-234.
5. Левченко О.Е. Сайнс-арт – высокотехнологичное развлечение?// Художественная культура. – 2017. – № 2 (20) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://artculturestudies.sias.ru/2017-2-20/yazyki/5245.html. – Дата доступа: 05.01.2023.
6. Флиер А.Я. Поп-наука: между познанием и развлечением // Знание. Понимание. Умение. – 2013. – № 1. – С. 32.
7. Сайнс-арт (Science-art) на примерах мировых и российских арт-проектов // https://artandyou.ru/articles/chto-takoe-sajns-art-science-art-i-kak-on-realizuetsya-v-mirovoj-i-rossijskoj-art-praktike/.
8. Чернова Е. Коллаборация искусства и науки: аспекты междисциплинарных художественных практик // Art And You. – 19 января. – 2021. [Электронный ресурс].– Режим доступа: https://artandyou.ru/articles/mezhdisczirlinarnye-hudozhestvennye-praktiki-aspekty-istoricheskogo-i-sovremennogo-opyta-kollaboraczij-v-iskusstve/. – Дата доступа: 05.01.2023.
9. Искусственный интеллект в современном искусстве // Официальный сайт Фонда «Сколково» [Электронный ресурс]. – Режим https://sk.ru/news/iskusstvennyy-intellekt-v-sovremennom-iskusstve/. – Дата доступа: 05.01.2023.


## АРТ-МЕНЕДЖМЕНТ В ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ХОРЕОГРАФИЧЕСКИХ КОЛЛЕКТИВОВ


*А.М. Чуешов*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


В современной социокультурной ситуации, когда большое развитие получила индустрия развлечений, проблема организации и руководства хореографическими коллективами стала актуальной. При этом основное внимание уделяется не только развитию хореографических умений и навыков, но и проведению продуктивной деятельности хореографических